Источник: “Народная газета” – 2024-08-30

# Дарога да слова

Сёлета гімн роднаму слову і матчынай мове будзе на ўвесь голас гучаць у Івацэвічах

Брэсцкай вобласці — гэты горад  31 жніўня і 1 верасня ўпершыню стане сталіцай XXXI Дня беларускага пісьменства. Трансляцыі асноўных канцэртаў форуму і тэматычныя перадачы прапануе ў гэтыя дні тэлеканал «Беларусь 3», паведамляе прэс-служба Белтэлерадыёкампаніі. Зробім невялікі агляд праграмы і гісторыі свята.

## Сустракаць гасцей гатовы

Дзень беларускага пісьменства адзначаецца ў нашай краіне з 1994 года ў першую нядзелю верасня і вандруе па гістарычным цэнтрам беларускай культуры, навукі і літаратуры. Да гэтай адказнай місіі Івацэвічы рыхтаваліся вельмі сур’ёзна. Тут пабудавалі новыя аб’екты, абнавілі фасады дамоў і дарогу, добраўпарадкавалі вуліцы. У холе мясцовай бібліятэкі імя Піліпа Пестрака ўстаноўлены інтэрактыўны стэнд.

Па традыцыі старт святочным мерапрыемствам дала навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў», таксама трыццаць першая. Распачалася яна 28 жніўня і праходзіць па маршруце Мінск — Святое Поле побач з вёскай Загор’е (Баранавіцкі раён) — Ляхавічы — Пінск — Іванава — Драгічын — Белаазёрск, а завяршыцца 1 верасня літургіяй у Івацэвічах.

Сярод штогадовых мерапрыемстваў, якія адбываюцца напярэдадні свята, пачэсны пасад заняў і міжнародны круглы стол з удзелам айчынных і замежных пісьменнікаў, грамадскіх і культурных дзеячаў. Вось і сёння,  30 жніўня, іх запрасілі ў Палац Рэспублікі.

А яшчэ раней, 20 жніўня, былі падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка», у якім прымалі ўдзел каля 15 тысяч беларускіх школьнікаў. У Івацэвічах пройдзе гала-канцэрт яго пераможцаў, тэлеверсію фіналу канал СТБ пакажа 1 верасня, у Дзень ведаў.

## Івацэвіцкія чытанні

31 жніўня пройдзе навукова-практычная канферэнцыя «Івацэвіцкія чытанні», якую Міністэрства інфармацыі ладзіць разам з Нацыянальнай акадэміяй навук. Будзе працаваць пляцоўка, якая пазнаёміць з турыстычным патэнцыялам Брэсцкай вобласці, у тым ліку і Івацэвіцкага раёна.

Удзельнікі і госці свята, сярод якіх вядомыя сучасныя аўтары з розных куткоў Беларусі і замежжа, атрымаюць магчымасць пазнаёміцца з багатай гісторыяй Івацэвіцкага краю, яго культурнымі здабыткамі і слаўнымі сынамі. У гэтых мясцінах, у вёсцы Сакоўцы, нарадзіўся пісьменнік Піліп Пестрак (1903—1978).

Падчас свята ў Івацэвічах узгадаюць і іншых знакамітых беларускіх літаратараў з нагоды іх юбілеяў: Міхася Лынькова (125 год з дня нараджэння), Аркадзя Куляшова (110), Івана Чыгрынава (90) і Міколу Мятліцкага (70).

31 жніўня ў вялікай зале мясцовага Дома культуры адбудзецца сустрэча з народным пісьменнікам Беларусі Мікалаем Чаргінцом, кампазітарам народным артыстам Беларусі Эдуардам Ханком і актрысай Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы народнай артысткай Беларусі Марыяй Захарэвіч. У кожнага з іх вельмі багатая творчая біяграфія, і ім ёсць чым падзяліцца са сваёй аўдыторыяй.

## Сачыце за эфірам

На працягу тыдня на «Беларусь 3» шла рэтраспектыва канцэртаў, прысвечаных Дню беларускага пісьменства. Сёння, 30 жніўня, яе завершыць тэлеверсія канцэрта

«Спеў дубраў», які адкрываў у 2021 годзе свята ў Капылі Мінскай вобласці. Пачатак у 23:00.

Дарэчы, творчая група тэлеканала «Беларусь 3» правядзе гэтыя дні разам з жыхарамі і гасцямі Івацэвічаў у выязной студыі. 31 жніўня і 1 верасня гледачоў сацыякультурнага канала чакаюць сустрэчы з удзельнікамі і арганізатарамі форуму. Дзякуючы тэматычнаму эфіру тэлегледачы змогуць адчуць атмасферу гэтага маштабнага дзейства.

У суботу, 31 жніўня, «Беларусь 3» пакажа цырымонію ўрачыстага адкрыцця Дня беларускага пісьменства і святочны канцэрт — пачатак у 21:00. Менавіта ў першы дзень на галоўнай фестывальнай сцэне ўзнагародзяць пераможцаў «Нацыянальнай літаратурнай прэміі».

У нядзелю, 1 верасня, у 14:00 на «Беларусь 3» пачнецца прамая трансляцыя ўрачыстай цырымоніі закрыцця форуму і яскравай канцэртнай праграмы.

Погляд на паэта

31 жніўня ў 15:30 у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» дакументальны фільм «Адзінка гарэння. Анатоль Аўруцін». Галоўны герой стужкі разважае пра месца паэта ў сучасным свеце, пра тое, якое ўздзеянне аказваюць лірычныя творы на чалавека. Здымачная група разам з Анатолем Юр’евічам наведала мясціны, дзе прайшло яго дзяцінства, паразмаўляла з калегамі і сябрамі майстра слова.

Па слядах класікаў

У нядзелю ўвазе самых маленькіх тэлегледачоў «Беларусь 3» прапануе падборку мультфільмаў айчыннай вытворчасці: «Класікі і шахматы», «Магістр вольных мастацтваў. Францыск Скарына» і «Я тайну ў глыбіні душы хаваю… Максім Багдановіч». У гэты ж дзень у 17:55 тэлеканал запросіць у «Культурнае падарожжа» па слядах Якуба Коласа — у Стаўбцоўскі раён.

Будзе цікава

Таксама на працягу двух дзён праграма «Беларусь 3» будзе складацца з мастацкіх фільмаў айчыннай вытворчасці, спектакляў паводле твораў беларускіх літаратараў і пазнавальных праектаў.

Дасягненням дзеячаў культуры і таленавітай моладзі прысвечаны дакументальныя і партрэтныя праекты «Суразмоўцы», «Кадры жыцця» і «Новыя людзі». Так, госцем праграмы «Суразмоўцы» Навума Гальпяровіча стане дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Ігар Капылоў. У «Кадрах жыцця» пабачым народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца. Праект «Новыя людзі» пазнаёміць са студэнткай філалагічнага факультэта БДУ Марыяй Шкляр.

У тэматычную падборку мастацкіх стужак увайшлі кінахіты «Дзікае паляванне караля Стаха» Валерыя Рубінчыка, «Белыя Росы» і «Расклад на паслязаўтра» Ігара Дабралюбава, «Хто смяецца апошнім?» Уладзіміра Корш-Сабліна, «Вадзіцель аўтобуса» Барыса Шадурскага. У гэтых фільмах ёсць усё тое, за што мы любім беларускае кіно, якое адзначыць сёлета 100 год: яскравыя акцёрскія работы, гуманістычны пасыл, вера ў чалавека і яго магчымасці.

А ў перапынках між кінастужкамі і тэлепраектамі прагучаць вершы сучасных беларускіх паэтаў. Праверыць веданне роднай мовы і літаратуры гледачы змогуць у суботу і нядзелю разам з удзельнікамі тэлевіктарын «Сваімі словамі» і «Веды ў кубе».

Неўміручая «Паўлінка»

Валянцін Пепеляеў. Дарога да слова

Убачыць тэатральнае ўвасабленне творчай спадчыны Янкі Купалы можна суботнім вечарам 31 жніўня. У праграме «Беларусь 3» тэлеверсія знакамітага спектакля Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Паўлінка» — пачатак у 23:05. Дарэчы, на гэтым тыдні тэатр імя Янкі Купалы распачаў «Паўлінкай» свой 105 сезон.

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

Да Дня беларускага пісьменства па заказе Міністэрства інфармацыі выдадзены кнігі, прысвечаныя гэтай зямлі і яе ўраджэнцам: «Івацэвіцкі край» (на беларускай, рускай і англійскай мовах) і «Мы помнім» (серыя «Беларусь літаратурная»).

ДАРЭЧЫ

У гэтым годзе Дзень беларускага пісьменства пройдзе пад знакам найважнейшых юбілейных дат: 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 30-годдзя інстытута прэзідэнцтва і 30-годдзя Канстытуцыі. Таксама ў мерапрыемствах свята будзе адлюстравана тэматыка Года якасці.